Падтрымай "Вясну" на PATREON

Глыбоцкую журналістку Таццяну Смоткіну аштрафавалі на 25 базавых велічынь

28.07.2015 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода слова



Глыбоцкі райсуд прызнаў журналістку вінаватай паводле артыкула 22.9 ч.2 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэннях (незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі).

Судовы працэс вяла суддзя Людміла Вашчанка. Журналістка хадайнічала, каб судовы працэс праходзіў на беларускай мове, але гэтае хадайніцтва было адхілена. Сведка, супрацоўніца райвыканкаму, словы якой былі працытаваныя ў артыкуле Таццяны Смоткінай, на суд не з'явілася.

Падставай для разбіральніцтва ў судзе стаў матэрыял "Дарогі ў Глыбокім стануць пазытыўнымі", які 9 чэрвеня быў размешчаны на сайце "Беларускага Радыё Рацыя". Паводле пратаколу аб адміністрацыйным правапарушэнні, журналістка не мае акрэдытацыі ў якасці замежнага карэспандэнта і таму парушае заканадаўства аб СМІ падчас свае прафесійнай дзейнасці.

"Суддзя Людміла Вашчанка задавала мне шмат дзіўных, на мой погляд, пытанняў. Напрыклад, чаму я працую журналісткай, хто параіў мне гэтым займацца, ці замаўляюць мне артыкулы па канкрэтных тэмах, ці шмат за гэта плацяць. На большую колькасць такіх пытанняў я проста адмаўлялася адказваць, бо яны не маюць дачынення да справы", - распавяла Таццяна Смоткіна.

Як вынікае з матэрыялаў судовай справы, яна была ініцыявана Глыбоцкай пракуратурай: гэтая структура даручыла міліцыі правесці праверку працы спадарыні Смоткінай. 25 чэрвеня старшы інспектар аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Глыбоцкага РАУС Вячаслаў Барыла склаў на яе пратакол правапарушэння за супрацоўніцтва з замежным СМІ без акрэдытацыі. Але Таццяна Смоткіна лічыць, што паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь кожны грамадзянін мае права атрымліваць інфармацыю і дзяліцца ёй з іншымі. Так яна казала і на судзе, і раней, падчас складання пратаколу ў міліцыі.

Судовае рашэнне пра пакаранне ў выглядзе штрафа памерам 4,5 мільёны рублёў Таццяна Смоткіна збіраецца абскарджваць у Віцебскім абласным судзе.

Такую ж скаргу рыхтуе і яшчэ адзін незалежны глыбоцкі журналіст Зміцер Лупач: 23 ліпеня старшыня Глыбоцкага райсуду Ірына Казак таксама аштрафавала яго на 25 базавых велічынь паводле таго самага артакула 22.9 ч.2 КаАП за супрацоўніцтва з замежным СМІ без акрэдытацыі.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ



ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

CC BY